# Хроніка мастацкіх падзей

* * *

5 чэрвеня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта адбылося адкрыццё выставы Аляксандра Саўчанкі. Мастак закончыў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С. М. Кірава ў 1982 г. З 1992 г. Аляксандр жыве ў горадзе Лепелі і працуе ў “Дзіцячай школе мастацтваў”. У сваіх творах мастак часцей за ўсё звяртаецца да такіх жанраў, як пейзаж, нацюрморт і партрэт.

* * *

8 чэрвеня 2019 адбылося падвядзенне вынікаў і адкрыццё заключнай выставы XI Міждзяржаўнага пленэра-конкурсу юных мастакоў “Палітра Прыдзвіння”, прысвечанага І. Ф. Хруцкаму ў выставачнай зале дзяржаўнай установы адукацыі “Дзіцячая мастацкая школа імя І. Ф. Хруцкага г. Наваполацка”. У гэтым годзе на пленэр прыехалі 52 удзельнікі з 14 гарадоў краін блізкага і далёкага замежжа. У журы пленэра-конкурсу юных мастакоў працавалі і дацэнты кафедры выяўленчага мастацтва С. М. Сотнікаў і М. Л. Цыбульскі.

* * *

З 11 чэрвеня па 30 жніўня 2019 года ў некалькіх выставачных залах Віцебска праводзілася 12 выстава-конкурс “ПЕРСПЕКТЫВА-2019”. Сярод асноўных мэтаў праекта – стымуляванне творчых здольнасцяў моладзі, выхаванне нацыянальнай ідэнтычнасці і самасвядомасці ў далучэнні да каштоўнасцяў нацыянальнай культуры, сусветных культурных здабыткаў, падтрымка творча адораных навучэнцаў і педагогаў, развіццё і ўмацаванне міжнародных культурных сувязяў. Журы конкурсу, у складзе якога працавалі дацэнты кафедры выяўленчага мастацтва С. М. Сотнікаў і М. Л. Цыбульскі, у сярэдзіне ліпеня падвяло вынікі выставы-конкурсу і вылучыла пераможцаў.

* * *

16 жніўня ў Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава Фёдара Кісялёва “Акварэльная элегія”. У экспазіцыі прадстаўлены каля 40 твораў, якія мастак напісаў у 1980–2010-я гады.

Прадстаўнік Віцебскай школы акварэлі Фёдар Кісялёў, вучань Ф. Гумена, А. Някрасава. Яго творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі сучаснага мастацтва, фондах Беларускага саюза мастакоў, Міністэрства культуры Расіі, Магілёўскім абласным мастацкім музеі і гісторыка-краязнаўчым, музеях Крычава, Клімавіч, Горак, у дзяржустановах Польшчы, Германіі, Францыі, а таксама ў прыватных калекцыях многіх краін свету. У 2006 г. Фёдар Кісялёў быў узнагароджаны медалём “За заслугі ў выяўленчым мастацтве”, а ў 2018 годзе яму ўручаны медаль Францыска Скарыны.

* * *

21 жніўня ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстава выпускніка мастацка-графічнага факультэта ВДУ Віктара Данілава “Наш край”. У 1970 годзе мастак закончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педінстытута. Вучыўся ў Д. П. Генеральніцкага, І. М. Сталярова, Р. П. Клікушына, В. І. Ральцэвіча.

Віктар Данілаў у асноўным працуе ў жанры пейзажа і нацюрморта, у алейным жывапісе і акварэлі.

* * *

Да 60-гадовага юбілею мастацка-графічнага факультэта і 70-годдзя мастака была прымеркавана выстава Віктара Крука “На жыццёвым шляху: спатканні і ўражанні”, якая адкрылася ў Віцебскім мастацкім музеі 6 верасня 2019.

У 1967–1972 гг. вучыўся на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педінстытута ў Ф. Гумена, І. Сталярова, А. Арлова, А. Някрасава. Жыве ў г. п. Шаркаўшчына Віцебскай вобласці. Працуе ва ўсіх жанрах жывапісу і графікі, але перавагу аддае партрэту і пейзажу.



Репозиторий ВГУ